А ведаеш, адкуль пайшоў выраз *абадраць як ліпку*? Некалі з ліпавай кары сяляне плялі лапці. *Ліпоўкі хутка зношваліся.* За год чалавек зношваў дзесяць пар такога абутку. А на адны лапці ішла кара трох маладых ліпак. Вось і стаялі яны абадраныя, голыя і паступова засыхалі *(Паводле Х. Гурыновіча)*.



Да слова *ліпоўкі* падбярыце аднакаранёвыя словы з тэксту.

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне слоў. Падкрэсліце дзейнік і выказнік у неразвітым сказе.

Дакажыце, што выдзелены ў тэксце сказ з'яўляецца развітым. Складзіце яго схему.

## § 25. Патрабаванні да падрабязнага пераказу. Падрабязны пераказ тэксту (з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў)

**!** Падрабязны пераказ тэксту поўна і паслядоўна перадае змест прапанаванага тэксту. Каб зрабіць падрабязны пераказ тэксту, трэба ўзнавіць тэкст, захоўваючы яго кампазіцыю і моўныя асаблівасці.

**177.** Прачытайце тэкст.

### У арэхах

Аднойчы Міколка і Косця пайшлі ў арэхі. Дамовіліся арэхі не есці, каб потым палічыць, хто больш нарваў. Разышліся хлопчыкі ў розныя бакі.

Ціха ў лесе ў канцы лета. Раптам Міколка пачуў, як справа арэх шчоўкнуў. Кастусь не ўтрымаўся! Потым другі

шчаўчок, трэці. Міколка трымаецца. Дзве кішэні поўныя. А Косця ўсё грызе ды грызе.

Тут і Міколку захацелася пакаштаваць арэхаў.

Нарэшце хлопчык вырашыў паглядзець, як там Косцік. Разгарнуў асцярожна галіны. А там на шырокім пні паважна сядзіць вавёрка і грызе арэхі. Ды што за прыгажуня!

А пераможцам стаў Косця. Як і дамовіліся, ён ніводнага арэха не з'еў *(Паводле Р. Ігнаценкі)*.

1. Адкажыце на пытанні па змесце тэксту:
а) Куды вырашылі пайсці Міколка і Косця?
б) Пра што яны дамовіліся паміж сабой?
в) Чаму Міколка вырашыў, што Косця парушыў дамову?
г) Ці спраўдзіліся здагадкі Міколкі?
д) Хто з хлопчыкаў стаў пераможцам?

2. Да якога стылю маўлення адносіцца тэкст?

3. Які тып маўлення тэксту? Абгрунтуйце адказ. Для гэтага знайдзіце часткі тэксту, якія адпавядаюць схеме:

**Пачатак дзеяння** → **Развіццё дзеяння** → **Заканчэнне дзеяння**

4. Прачытайце табліцу. Утварыце апорныя словазлучэнні, дадаўшы словы з тэксту. Выпішыце іншыя апорныя словазлучэнні.

| План тэксту | Апорныя словазлучэнні |
|---|---|
| 1. Хто больш? | Міколка і ..., пайсці ў ..., дамовіліся ..., ... . |
| 2. Кастусь не ўтрымаўся! | Ціха ў лесе, пачуў шчаўчок, ..., ... . |
| 3. Што за прыгажуня! | Вырашыў паглядзець, ... . |
| 4. Кастусь — пераможца. | ... |

З дапамогай плана і апорных словазлучэнняў вусна перакажыце тэкст.



Правообладатель Академия образования

**178.** Уважліва прачытайце тэкст. Растлумачце лексічнае значэнне выдзеленых слоў.

***сч**апі́цца* [шч]

## Задзіры

Юраська сядзеў ля акна і назіраў, як на двары разгараецца бойка. Два чубаценькія вераб'і счапіліся, ажно пер'е з іх ляціць. Што яны не падзялілі? Хлопчык пачаў прыглядацца да **задзір**. Адзін верабей знайшоў недзе хлебную скарыначку. Другі, больш моцны і нахабны, рашыў адабраць. Скарыначка ляжала побач, быццам прыз для пераможцы.

Вераб'і **заўзята** дзяўбалі адзін аднаго. Трэба ім дапамагчы. Хлопчык адчыніў кухонную шафу, набраў жменю круп і сыпануў праз фортку задзірам.

Вераб'і мігам разляцеліся. Потым пасмялелі, сышліся і пачалі **сілкавацца**. Юра глядзеў на іх і радаваўся: гэта ён памірыў птушак *(Паводле В. Ткачова)*.

Падрыхтуйцеся да пісьмовага пераказу тэксту.

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту.
2. Вызначце тып маўлення тэксту.
3. Выдзеліце і зачытайце часткі, якія адпавядаюць будове апавядання.
4. Вызначце стыль маўлення тэксту. Якія словы і выразы пацвярджаюць гэта?
5. Вызначце ў кожнай частцы апорныя словы, якія перадаюць паслядоўнасць падзей.
6. Складзіце план тэксту.
7. Прачытайце тэкст яшчэ раз.
8. Напішыце чарнавы варыянт пераказу.
9. Перачытайце свой варыянт пераказу, прааналізуйце тэкст:
   а) наколькі поўна раскрыта тэма апавядання;
   б) ці перададзена асноўная думка тэксту.
10. Праверце правапіс слоў і пастаноўку знакаў прыпынку.